# ПРАВІЛЫ АДПРАЦОЎКІ ПРОПУСКАЎ ЗАНЯТКАЎ

1. Тэму, якая адпрацоўваецца, неабходна цалкам перапісаць з адпаведнага файла ў частцы «Канспект» на белыя аркушы фармату А4 з захаваннем каляровага афармлення (гл. узор).
2. Кожны аркуш падпісваецца асадкай у верхнім правым куце з указаннем прозвішча, імя, нумары групы (гл. узор).
3. Кожны аркуш скануецца ці фатаграфуецца.
4. Малюнкі аб’ядноўваюцца ў файл pdf; арыентацыя кніжная; кожная тэма афармляецца ў асобны файл pdf.
5. Назва файла: Прозвішча Імя – Нумар групы – Тэма, напрыклад: Самасуй Самсон – 4 гр – Назоўнікі 3-га скланення
6. Файл высылаецца на vk (vk.com/tananushka) ці skype (Kir Tananushka).

Напрыклад, была прапушчана тэма «Назоўнікі 3-га скланення. Утварэнне nom. sg. назоўнікаў 3-га скланення».

1. Знайдзіце яе на адпаведнай старонцы на сайце graecolatini.by:


Канспект. Заданні

- Фанетыка Заданне
- Назоўнік. 1-е скланенне назоўнікаў. Прыназоўнікі. Дзеяслоў sum Заданне
- Дзеяслоў. Praesens indicatīvi actīvi. Infinitīvus praesentis actīvi Заданне
- Imperatīvus praesentis actīvi. Выказванне забароны Заданне
- 2-е скланенне назоўнікаў Заданне
- Прыметнік. Прыметнікі 1-2-га скланення Заданне
- Займеннікі. Займеннікавыя прыметнікі. Дзеясловы, вытворныя ад дзеяслова sum, esse Заданне
- Infinitīvus praesentis passīvi. Praesens indicatīvi passīvi. Незалежная і залежная канструкцыі. Ablatīvus auctōris
- Imperfectum indicatīvi
- Futūrum I indicatīvi
- Назоўнікі 3-га скланення. Утварэнне nom. sg. назоўнікаў 3-га скланення
- Асаблівасці назоўнікаў 3-га скланення
- Прыметнікі 3-га скланення
- Асноўныя формы дзеяслова. Perfectum indicatīvi actīvi
- Plusquamperfectum indicatīvi actīvi. Futūrum II indicatīvi actīvi

2. Адкройце файл з адпаведнай тэмай (у нашым выпадку Назоўнікі 3-га скланення. Утварэнне nom. sg. назоўнікаў 3-га скланення):



НАЗОЎНІКІ 3-ГА СКЛАНЕННЯ

Гэта назоўнікі ўсіх родаў, якія ў *gen. sg.* маюць канчатак **-is**.
Аснова назоўнікаў 3-га скланення заўсёды вызначаецца па форме *gen. sg.*

**Тыпы 3-га скланення**

1. Зычны тып. Гэта **няроўнаскладовыя** назоўнікі (у *gen. sg.* больш складоў, чым у *nom. sg.*) **з асновай на адзін зычны**: homo, homĭn-is *m* — *чалавек*; auctorĭtas, auctoritāt-is *f* — *улада*; tempus, tempŏr-is *n* — *час*.

2. Змешаны тып. Гэта:
а) **няроўнаскладовыя** назоўнікі **з асновай на два больш зычныя**: urbs, urb-is *f* — *горад*, dens, dent-is *m* — *зуб*, os, oss-is *n* — *костка*;
б) **роўнаскладовыя** назоўнікі (у *nom. sg.* і *gen. sg.* аднолькавая колькасць складоў), якія ў *nom. sg.* заканчваюцца на -es, -is: civis, civ-is *m* — *грамадзянін*, aedes, aed-is *f* — *будынак*.

3. Галосны тып. Гэта назоўнікі **ніякага роду**, якія ў *nom. sg.* заканчваюцца на -e, -al, -ar: rete, ret-is *n* — *сетка*, anĭmal, animāl-is *n* — *жывёла*, nectar, nectăr-is *n* — *нектар*.

Такім чынам, кожны тып характарызуецца дзвюма прыкметамі:

| Тып | 1-я прыкмета | 2-я прыкмета |
|---|---|---|
| Зычны | Няроўнаскладовы назоўнік | Аснова на адзін зычны |
| Змешаны | Няроўнаскладовы назоўнік | Аснова на два і больш зычныя |
| | Роўнаскладовы назоўнік | *Nom. sg.* на **-es**, **-is** |

3. Цалкам перапішыце змест файла на белыя аркушы фармату А4 з захаваннем каляровага афармлення:



Самсон Самасуй, 19 гр.

НАЗОЎНІКІ 3-ГА СКЛАНЕННЯ

Гэта назоўнікі ўсіх родаў, якія ў gen. sg. маюць канчатак -is.

Аснова назоўнікаў 3-га скланення заўсёды вызначаецца па форме gen. sg.

ТЫПЫ 3-ГА СКЛАНЕННЯ

1. Зычны тып. Гэта няроўнаскладовыя назоўнікі (у gen. sg. больш складоў, чым у nom. sg.) з асновай на адзін зычны: homo, homĭn-is m — чалавек; auctorĭtas, auctoritāt-is f — улада; tempus, tempŏr-is n — час.

2. Змешаны тып. Гэта:

а) няроўнаскладовыя назоўнікі з асновай на два больш зычныя: urbs, urb-is f — горад, dens, dent-is m — зуб, os, oss-is n — костка;

б) роўнаскладовыя назоўнікі (у nom. sg. і gen. sg. аднолькавая колькасць складоў), якія ў nom. sg. заканчваюцца на -es, -is: civis, civ-is m — грамадзянін, aedes, aed-is f — будынак.

3. Галосны тып. Гэта назоўнікі ніякага роду, якія ў nom. sg. заканчваюцца на -e, -al, -ar: rete, ret-is n — сетка, anĭmal, animāl-is n — жывёла, nectar, nectăr-is n — нектар.

Самсон Самасуй, 19 гр.

## НАЗОЎНІКІ 3-ГА СКЛАНЕННЯ

Гэта назоўнікі ўсіх родаў, якія ў gen. sg. маюць канчатак -is.

Аснова назоўнікаў 3-га скланення заўсёды вызначаецца па форме gen. sg.

### ТЫПЫ 3-ГА СКЛАНЕННЯ

1. Зычны тып. Гэта няроўнаскладовыя назоўнікі (у gen. sg. больш складоў, чым у nom. sg.) з асновай на адзін зычны: homo, homin-is m — чалавек; auctoritas, auctoritāt-is f — улада; tempus, tempŏr-is n — час.

2. Змешаны тып. Гэта:

а) няроўнаскладовыя назоўнікі з асновай на два больш зычныя: urbs, urb-is f — горад, dens, dent-is m — зуб, os, oss-is n — костка;

б) роўнаскладовыя назоўнікі (у nom. sg. і gen. sg. аднолькавая колькасць складоў), якія ў nom. sg. заканчваюцца на -es, -is: civis, civ-is m — грамадзянін, aedes, aed-is f — будынак.

3. Галосны тып. Гэта назоўнікі ніякага роду, якія ў nom. sg. заканчваюцца на -e, -al, -ar: rete, ret-is n — сетка, animal, animāl-is n — жывёла, nectar, nectăr-is n — нектар.

Такім чынам, кожны тып характарызуецца дзвюма прыкметамі:

| Тып | 1-я прыкмета | 2-я прыкмета |
|---|---|---|
| Зычны | Няроўнаскладовы назоўнік | Аснова на адзін зычны |
| Змешаны | Няроўнаскладовы назоўнік | Аснова на два і больш зычныя |
| | Роўнаскладовы назоўнік | Nom. sg. на -es, -is |
| Галосны | Назоўнік ніякага роду | Nom. sg. на -e, -al, -ar |

### СЛОЎНІКАВАЯ ФОРМА

Пасля формы nom. sg. звычайна прыводзіцца:

1) для аднаскладовых назоўнікаў (у nom. sg. адзін склад) — поўная форма gen. sg.: urbs, urbis f;

2) для няроўнаскладовых назоўнікаў — частка формы gen. sg.: homo, ĭnis m;

3) для роўнаскладовых назоўнікаў — канчатак gen. sg.: civis, is m.

УЗОР

Самсон Самасуй, 19 гр.

## СКЛОНАВЫЯ КАНЧАТКІ

| Склон | Singulāris | | Plurālis | |
|---|---|---|---|---|
| | m, f | n | m, f | n |
| Nom. | розныя | | es | a (ia*) |
| Gen. | is | | um (ium**) | |
| Dat. | i | | ĭbus | |
| Acc. | em | = nom. | es | = nom. |
| Abl. | e (i*) | | ĭbus | |
| Voc. | = nom. | | = nom. | |

Заўвагі.
* Канчаткі галоснага тыпу.
** Канчаткі галоснага і змешанага тыпаў.

Такім чынам, канчаткі назоўнікаў розных тыпаў 3-га скланення адрозніваюцца ў трох формах:

| Тып | Abl. sg. | Nom. pl. n | Gen. pl. |
|---|---|---|---|
| Зычны | e | a | um |
| Змешаны | e | a | ium |
| Галосны | i | ia | ium |

## УЗОР СКЛАНЕННЯ

lex, legis f — закон; jus, juris n — права; dens, dentis m — зуб; civis, is m — грамадзянін; os, ossis n — костка; rete, is n — сетка

| Склон | Зычны тып | | Змешаны тып | | | Галосны тып |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | Singulāris | | | | | |
| Nom. | lex | jus | dens | civis | os | rete |
| Gen. | leg-is | jur-is | dent-is | civ-is | oss-is | ret-is |
| Dat. | leg-i | jur-i | dent-i | civ-i | oss-i | ret-i |
| Acc. | leg-em | jus | dent-em | civ-em | os | rete |
| Abl. | leg-e | jur-e | dent-e | civ-e | oss-e | ret-i |
| Voc. | lex | jus | dens | civis | os | rete |

УЗОР

| Plurālis | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Nom. | leg-es | jur-a | dent-es | civ-es | oss-a | ret-ia |
| Gen. | leg-um | jur-um | dent-ium | civ-ium | oss-ium | ret-ium |
| Dat. | leg-ĭbus | jur-ĭbus | dent-ĭbus | civ-ĭbus | oss-ĭbus | ret-ĭbus |
| Acc. | leg-es | jur-a | dent-es | civ-es | oss-a | ret-ia |
| Abl. | leg-ĭbus | jur-ĭbus | dent-ĭbus | civ-ĭbus | oss-ĭbus | ret-ĭbus |
| Voc. | leg-es | jur-a | dent-es | civ-es | oss-a | ret-ia |

## УТВАРЭННЕ NOMINATIVUS SINGULARIS НАЗОЎНІКАЎ 3-ГА СКЛАНЕННЯ

Nom. sg. назоўнікаў 3-га скланення утвараецца двума спосабамі: сігматычна і асігматычна.

### СІГМАТЫЧНАЕ ЎТВАРЭННЕ

Сігматычна (ад назвы літары грэчаскага алфавіта сігма), г. зн. пры дапамозе канчатка -s, утвараецца nom. sg. назоўнікаў мужчынскага і жаночага роду з асновамі на -b, -p, -m, -i, -c, -g, -t, -d.

1) асновы на -b, -p, -m, -i. У nom. sg. аснова не змянаецца:

| Аснова | Прыклад |
|---|---|
| pleb- | plebs, pleb-is n — плебс, чэрнь |
| stip- | stips, stip-is f — узнос |
| hiem- | hiems, hiĕm-is f — зіма |
| fini- | finis, fin-is m — канец |

2) асновы на -t, -d. У nom. sg. t + s, d + s > s. Могуць адбывацца фанетычныя змены галосных:

| Аснова | Прыклад |
|---|---|
| ped- | pes, ped-is m — нага |
| salut- | salus, salūt-is f — дабро |
| milet- | miles, milĭt-is m — воін |

УЗОР

3) асновы на -c, -g. В nom. sg. c + s, g + s > x:

| Аснова | Прыклад |
|---|---|
| duc- | dux, duc-is m — правадыр |
| leg- | lex, leg-is f — закон |

## Асігматычнае ўтварэнне

Асігматычна, г. зн. пры дапамозе нулявога канчатка, утвараецца nom. sg. назоўнікаў мужчынскага і жаночага роду з асновамі на -l, -r, -n, -s, а таксама ўсіх назоўнікаў ніякага роду.

1) асновы на -l, -r. Nom. sg. супадае з асновай:

| Аснова | Прыклад |
|---|---|
| consul- | consul, consŭl-is m — консул |
| uxor- | uxor, uxōr-is m — жонка |

У назоўнікаў на -ter галосны e ва ўскосных склонах выпадае:

| Аснова | Прыклад |
|---|---|
| pater- | pater, patr-is m — бацька |

2) асновы на -on. У nom. sg. канцавы -n адпадае:

| Аснова | Прыклад |
|---|---|
| sermon- | sermo, sermōn-is m — гутарка |

3) асновы на -in. У nom. sg. канцавы -n адпадае, галосны i > o:

| Аснова | Прыклад |
|---|---|
| ordin- | ordo, ordĭn-is m — парадак |
| margin- | margo, margĭn-is f — край |
| homin- | homo, homĭn-is m — чалавек |

4) шматскладовыя асновы мужчынскага і жаночага роду на -is, -es, -os. У nom. sg. і ў іншых склонах адбываюцца фанетычныя змены (паміж галоснымі s > r; галосны ĭ перад r пераходзіць у ĕ; аснова на -r, які ўзнік з s, у большасці назоўнікаў стала формай nom. sg.):

| Аснова | Прыклад |
|---|---|
| cinis- | cinis, cinĕr-is m — попел |
| mulies- | mulier, muliĕr-is f — жанчына |
| arbos- | arbor, arbŏr-is f — дрэва |

УЗОР

5) аднаскладовыя асновы мужчынскага і жаночага роду на -s. Nom. sg. супадае з асновай; ва ўскосных склонах s > r:

| Аснова | Прыклад |
|---|---|
| flos- | flos, flor-is m — кветка |

6) асновы ніякага роду на -men. Nom. sg. супадае з асновай; ва ўскосных склонах галосны e > ĭ.

| Аснова | Прыклад |
|---|---|
| nomen- | nomen, nomĭn-is n — імя |

7) Асновы ніякага роду на -es, -os. Nom. sg. супадае з асновай, але адбываюцца фанетычныя змены галосных (o, e > u). Ва ўскосных склонах паміж галоснымі s > r:

| Аснова | Прыклад |
|---|---|
| corpos- | corpus, corpŏr-is n — цела |
| genes- | genus, genĕr-is n — род |

УЗОР